# ЦЕНТР СОВРЕМЕННЫХ МЕТОДИК ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

## БАЦЬКАМ ПРА СУЧАСНУЮ МОЎНУЮ СІТУАЦЫЮ Ў БЕЛАРУСІ І МЭТУ МАЎЛЕНЧАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ ВА ЎМОВАХ БЛІЗКАРОДНАСНАГА БІЛІНГВІЗМУ



- **Сучасная моўная сітуацыя ў Беларусі характарызуецца суіснаваннем і выкарыстаннем ў зносінах беларускай і рускай моў і можа быць вызначана як беларуска-рускае двухмоўе.**

- **Нацыянальнае беларуска-рускае двухмоўе сярод грамадства прадстаўлена:**

**- *руска-беларускім двухмоўем*, калі побач з рускай мовай двухмоўныя бацькі дзяцей дашкольнага ўзросту выкарыстоўваюць беларускую мову;**

**- *індывідуальным беларуска-рускім двухмоўем,* калі разам з роднай беларускай мовай двухмоўныя бацькі дзяцей дашкольнага ўзросту выкарыстоўваюць і рускую мову;**

**- *індывідуальным беларускім або рускім аднамоўем.***

- **Для большасці дзяцей у нашай краіне першай мовай, на якой яны вучацца гаварыць і думаць, мець зносіны з акружаючымі іх людзьмі, з'яўляецца руская мова.**

- **Што да беларускай мовы, то яна выступае для іх і як мова, на аснове якой ажыццяўляецца іх нацыянальна-культурная сацыялізацыя (інкультурацыя) – родная мова, і як мова наладжвання беларускамоўных зносін – другая мова.**



- **З гэтай нагоды можна сцвярджаць, што для дзяцей, якія з дзяцінства авалодваюць маўленнем на рускай мове, роднымі з'яўляюцца дзве мовы – руская і беларуская. Руская – па крытэрыях паходжання, кампетэнтнасці і функцыянальнасці, а беларуская – па крытэрыі ідэнтыфікацыі.**

- ***Асаблівай увагі з вашага боку патрабуе авалоданне дзецьмі беларускай мовай як другой роднай.* Гэта звязана з тым, што менавіта беларуская мова выступае спецыфічным спосабам існавання і захавання нацыянальнай культуры, і ў той жа час сама з'яўляецца яе прадуктам. Мова – гэта інструмент і люстэрка культуры: мова праз культуру, культура праз мову.**